Пераказ тэксту навуковага стылю

8 клас

Слоўнікі

Раздзел м(о,а)вазнаўства, які вывучае тэорыю і прынцыпы практычнага складання слоўнікаў, носіць назву **лексікаграфія.** У лексікаграфіі выдзяляюць дзве групы слоўнікаў –лінгвістычныя і энц(і,ы)клапедычныя.

**Лінгвістычныя** слоўнікі тлумачаць значэнні слоў і фразеалагізмаў, вызначаюць іх ужыванне, напісанне, вымаўленне, паходжанне, утварэнне, даюць граматычную і стылістычную характарыстыкі. Яны бываюць аднамоўныя, двухмоўныя і шматмоўныя. Аднамоўныя слоўнікі падзяляюцца на тлумачальныя, арфаграфічныя, фразеалагічныя, арфаэпічныя, дыялектныя, тэрміналагічныя, этымалагічныя і іншыя. Двухмоўныя і шматмоўныя – гэта перакладныя слоўнікі, у якіх словамі роднай мовы тлумачацца словы чужой мовы і наадварот (руска-беларускі, беларуска-(у,ў)краінска-польскі і іншыя). У **тлумачальных** слоўніках раскрываюцца значэнні слоў, даецца іх граматычная характарыстыка, адлюстравана мнагазначнасць і аманімія, прыводзяцца фразеалагізмы са словам, якому прысвечаны слоўнікавы артыкул.

Будова **слоўнікавага артыкула** наступная: даецца загаловачнае слова з абазначэннем націску, потым ідуць граматычныя формы. Значэнне слова раскрываецца апісаннем ці падборам сінонімаў. **Арфаграфічныя** слоўнікі вызначаюць правільнае напісанне слоў, садзейнічаюць замацаванню ў пісьмовай практыцы нормаў беларускага правапісу.

**Энцыклапедычныя** слоўнікі падаюць кароткія звесткі па ўсіх ці асобных галінах навукі і тэхнікі, літаратуры, мовы, мастацтва. Гэта даведачныя выданні, у якіх тлумачацца (не)словы, а самі паняцці, прадметы, з(ь,')явы. Энцыклапедычныя слоўнікі ра(с,сс)казваюць аб гістарычных асобах, выдатных дзеячах навукі, культуры, падаюць іх біяграфіі, звесткі з грама(ц,дс)ка-палітычнага жыцця, геаграфічныя, эканамічныя даведкі пра краіны свету.

Часам слоўнікі называюць кнігамі, у якіх сабраны сусвет. З гэтым можна пагадзіцца. Чалавечая памяць абмежавана ў сваіх ма(х,г)чымасцях. Чалавек (не)можа запомніць усёй складанай інфармацыі якая назапашваецца з гадамі. І тут на дапамогу нашай памяці прыходзяць розныя слоўнікі даведнікі. Яны на працягу стаго**ддз**яў захоўваюць звесткі даты лічбы словы. Пры неабходнасці мы звяртаемся да слоўнікаў і яны заўсёды дапамагаюць сваім *дапытлівым* чытачам.

- Устаўце прапушчаныя знакі прыпынку ў апошнім абзацы. Растлумачце